# ЗАЙМАЛАСЯ СВІТАННЕ...

*Станкевіч Гемел Міхайлавіч нарадзіўся ў 1924 годзе ў вёсцы Сяліба Быхаўскага раёна. За некалькі год да Вялікай Айчыннай вайны разам з бацькамі пераехаў у Ленінград. Перанёс першую блакадную зіму. Маці і бацька памёрлі. Гемел быў эвакуіраван у горад Ташкент. У 1943 годзе быў прызван у рады Савецкай Арміі. Закончыў танкавае вучылішча. З лістапада 1944 года на 1-м Украінскім фронце камандаваў танкавым узводам 11-й Новаград-Валынскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава танкавай брыгады.*

*Званне Героя Савецкага Саюза малодшаму лейтэнанту Г. М. Станкевічу прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 чэрвеня 1945 года.*

*Памёр у 1962 годзе.*

– Бранябойна-запальваючай, прамой наводкай па фашысцкаму танку... агонь!

"Трыццацьчацвёрка" ўздрыгнула, а праз імгненне машыну са злавеснай свастыкай на брані завалакло густым дымам.

– Уперад! – загадаў малодшы лейтэнант Станкевіч, і грозная машына паімчалася на пазіцыі гітлераўцаў.

– Камандзір, злева гарматы! – далажыў механік-вадзіцель.

– Душы!

Машына рэзка нахілілася. За бортам раздалося скрыгатанне металу...

Савецкія танкі на вялікай скорасці ўварваліся на ўскраіны Губена. Гэты горад, размешчаны на рацэ Заходняя Нэйсе, непадалёку ад яе ўпадзення ў Одэр, быў ператворан праціўнікам у магутны апорны пункт. Сістэма абароны гітлераўцаў нечым напамінала малодшаму лейтэнанту Станкевічу горад Фрэйштадт. Там, як і тут, пярэдні край быў насычан мноствам агнявых сродкаў, жалезабетоннымі ўмацаваннямі, міннымі палямі. Тады танкавы ўзвод Станкевіча прарваўся ў абход на заходнюю ўскраіну горада, туды, дзе фашысты менш за ўсё чакалі савецкія танкі.

– Ці не зрабіць такі манеўр і зараз? – падумаў Станкевіч.

Тры "трыццацьчацвёркі" змянілі напрамак і панесліся ў абход Губена. Знішчаючы на хаду жывую сілу і тэхніку ворага, грозныя машыны ўварваліся на заходнюю ўскраіну горада. Чатыры дні вялі яны цяжкі бой. Экіпаж Станкевіча знішчыў у гэтым баі два варожыя танкі, тры самаходныя і тры супрацьтанкавыя гарматы, мінамётную батарэю і першым прарваўся да цэнтра Губена.

Раптам машына спынілася. Едкі дым стаў прасочвацца ў стальную каробку. Языкі полымя заскакалі па брані. Цяжэй стала дыхаць. Навісла пагроза ўзрыву боепрыпасаў.

– Выключыць матор! – загадаў Станкевіч механіку-вадзіцелю.

У наступіўшай цішыні больш выразна чуліся ўзрывы, цокат куль і асколкаў па брані. Выратаваць машыну можна было толькі выйшаўшы з яе пад кулі і асколкі. Другога выйсця не было. Гэта разумелі ўсе члены экіпажа. І таму не здзівіліся, калі пачулі спакойны голас камандзіра аб выхадзе з машыны праз ніжні, аварыйны люк. Сам Станкевіч застаўся ў танку і снарад за снарадам пасылаў уздоўж вуліц, па якіх наступалі гітлераўцы.

Кожную мінуту рызыкуючы жыццём, танкісты патушылі агонь. Але машына была бездапаможнай. Перабітая гусеніца распасцёрлася на бруку.

Без стомы біла танкавая гармата. Не змаўкаў кулямёт. Пад іх акампанемент два танкісты нацягвалі неймаверна цяжкую гусеніцу.

Паверыўшы ў тое, што адзінокая і зраненая машына ўжо нікуды ад іх не ўцячэ, гітлераўцы спынілі атакі. Савецкія воіны думалі інакш. Уся ноч прайшла ў цяжкай працы. Світала.

– Танк на хаду! – радасна сказаў механік-вадзіцель.

– Добра. Мы яшчэ паваюем, – прагаварыў Станкевіч, уладкоўваючыся на сваім камандзірскім месцы. – Уперад, на Берлін!

Танк ажыў і рынуўся на гармату, з якой немцы хацелі расстраляць нерухомую машыну...

**Займалася світанне... // Магілёўская праўда. — 1970. — 26 верасня. — С. 4.**